**ВОДЗЫЎ**
афіцыйнага апанента
доктара мастацтвазнаўства, прафесара Р. Ф. Шауры
на дысертацыю Шындлер Эліны Генадзьеўны
"Пластычны фальклор і фальклярызм
у сучасным народным мастацтве Беларусі",
прадстаўленай на суісканне вучонай ступені кандыдата мастацтвазнаўства
па спецыяльнасці 17.00.04 –
выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва і архітэктура

**Адпаведнасць зместу дысертацыі заяўленай спецыяльнасці і галіне навукі.**

У дысертацыі Э. Г. Шындлер "Пластычны фальклор і фальклярызм у сучасным народным мастацтве Беларусі" даследуюцца адзнакі пластычнага фальклору і праявы пластычнага фальклярызму ў сучасным народным дэкаратыўна-прыкладным мастацтве Беларусі, што адпавядае заяўленай спецыяльнасці 17.00.04 – выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва і архітэктура, а таксама галіне навукі – мастацтвазнаўства.

**Актуальнасць тэмы дысертацыйнага даследавання.**

Сучасная мастацкая дзейнасць у галіне традыцыйных рамёстваў, аб'яднаная паняццем «народнае мастацтва», дэманструе шэраг мастацкіх напрамкаў, якія мэтазгодна дыферэнцыраваць у больш дробныя катэгорыі для найбольш эфектыўнага вывучэння кожнага з іх. У сваёй рабоце Э. Г. Шындлер вылучае і даследуе «пластычны фальклор», пад якім разумеюцца пластычныя віды мастацкай дзейнасці сялянскай традыцыйнай супольнасці, мастацтва якой развівалася ва ўмовах натуральнай вытворчай гаспадаркі і аграрна-абрадавай звычаёвасці. Тым самым аўтар падкрэслівае важную ролю і каштоўнасць сялянскага пластычнага мастацтва, якое, побач з песенным і абрадавым фальклорам, у найбольшай ступені яўляе самабытнасць традыцыйнай беларускай культуры, а таму вартае захавання і перадачы наступным пакаленням у сваёй мастацкай, вытворчай і семантычнай цэласнасці.

Небяспека падмены традыцыйнай народнай пластыкі сучаснымі мастацкімі інтэрпрэтацыямі «па матывах» народных традыцый часта вядзе да размывання межаў паняцця «народнае мастацтва». А таму размежаванне адзнак

пластычнага фальклору і праяў пластычнага фалькларызму у сучасным народным мастацтве, праведзенае Э. Г. Шындлер у рамках дысертацыі, адкрывае большыя магчымасці як для развіцця напрамку сучаснага мастацкага пераасэнсавання народнай традыцыі, так і захавання пластычнага фальклору як каштоўнай для культуры мастацкай з'явы.

Вылучэнне адзнак пластычнага фальклору павінна не толькі спрыяць захаванню і перадачы наступным пакаленням найбольш вартых і самабытных адметнасцей традыцыйнага пластычнага мастацтва, але і садзейнічаць павышэнню ступені адпаведнасці сучасных вырабаў народнага мастацтва адзнакам традыцыйнай пластыкі не толькі на ўзроўні мастацкай формы, але таксама вытворчых тэхналогій і семантычнага напаўнення.

**Ступень навізны навуковых вынікаў, якія выносяцца на абарону.**

Усе палажэнні, якія выносяцца аўтарам дысертацыі на абарону, з'яўляюцца вынікам самастойна праведзенага даследавання і маюць высокую ступень навізны. У дысертацыі Э. Г. Шындлер упершыню ў беларускім мастацтвазнаўстве комплексна і ўсебакова разглядае праблему трансфармацыі мастацкай формы сучасных вырабаў народнага мастацтва і фалькларызацыі сучаснай народнай творчасці.

Навізной характарызуецца і спроба размежавання адзнак пластычнага фальклору і праяў пластычнага фалькларызму ў сучасных відах народнага мастацтва. Распрацаваны Э. Г. Шындлер алгарытм вызначэння ступені фалькларызаванасці сучасных напрамкаў, з'яў і твораў народнага мастацтва з'яўляецца наватарскім і ўяўляе сабой каштоўны унёсак у распрацоўку праблемы фалькларызацыі пластычных відаў народнай творчасці. Для дасягнення мэты дысертацыі аўтарам удакладнены значэнні базавых для галіны народнага мастацтва тэрмінаў, катэгорый і паняццяў, распрацаваны тэрміналагічны падмурак, які таксама характарызуецца навізной.

**Абгрунтаванасць і дакладнасць высноў і рэкамендацый, сфармуляваных у дысертацыі.**

Усе высновы і рэкамендацыі, сфармуляваныя аўтарам дысертацыі, з'яўляюцца навукова абгрунтаванымі і маюць вялікую ступень дакладнасці, якая пацвярджаецца выкарыстаннем шырокага кола літаратурных крыніц па праблемах традыцыйнага мастацтва (244 найменняў бібліяграфічнага спіса на беларускай, рускай, польскай, нямецкай і ангельскай мовах).

Для дасягнення пастаўленай мэты дысертацыі, а менавіта вызначэння адзнак пластычнага фальклору і праяў пластычнага фалькларызму ў сучасным

народным дэкаратыўна-прыкладным мастацтве Беларусі, аўтар абапіраецца на комплекс агульнанавуковых і мастацтвазнаўчых метадаў даследавання: гісторыка-тэарэтычны, параўнальна-гістарычны, аналітычны, сістэмна-структурны, фармальна-стылістычны, іканаграфічны, інтэрвью, метад гістарычнай рэканструкцыі і метад эмпатыі. Апошнія два метады з'яўляюцца ўнікальнымі для даследаванняў у галіне народнага мастацтва, іх выкарыстанне дазволіла аўтару паглыбіцца ў культурнае асяроддзе традыцыйнай супольнасці з мэтай лепшага разумення светапогляду носьбітаў традыцыйнай культуры, што павышае ступень дакладнасці і дакладнасці высноў, зробленых Э. Г. Шындлер.

Высновы па раздзелах, заключэнне, рэкамендацыі па практычным выкарыстанні вынікаў дысертацыі сфармуляваны паслядоўна і лагічна ў адпаведнасці з задачамі і структурай даследавання і з'яўляюцца навукова абгрунтаванымі. Меркаванні дысертанта, прадстаўленыя ў заключэнні, аргументаваны і аб'ектыўны. Сфармуляваныя высновы заснаваны на прамежкавых выніках даследавання, якія лагічна вынікаюць з аналітычнага матэрыялу і адпавядаюць палажэнням, вынесеным на абарону. Рэкамендацыі па практычным выкарыстанні матэрыялаў пацвярджаюцца актамі аб укараненні. У прыватнасці, вынікі даследавання сталі аб'ектам укаранення ў адукацыйны працэс УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт» для студэнтаў 1 і 2 ступені спецыяльнасці «Дызайн прадметна-прасторавага асяроддзя».

**Навуковая, практычная, эканамічная і сацыяльная значнасць вынікаў дысертацыі з указаннем рэкамендацый па іх выкарыстанні.**

Выяўленыя Э. Г. Шындлер адзнакі пластычнага фальклору і праявы пластычнага фальклярызму ў сучасных відах народнага мастацтва – ручным ткацтве, ганчарстве і саломапляценні ўяўляюць сабой каштоўны матэрыял з пункту гледжання практычнай значнасці. Аналітычны матэрыял дысертацыі можа выкарыстоўвацца ўдзельнікамі мастацкай дзейнасці ў галіне народнай творчасці для аднаўлення і захавання традыцыйных відаў мастацтва.

Для мастакоў і майстроў народнай творчасці каштоўным з'яўляецца прапанаваны Э. Г. Шындлер алгарытм выяўлення адзнак пластычнага фальклору і праяў пластычнага фальклярызму, які можа выкарыстоўвацца падчас мастацкай распрацоўкі формы традыцыйных вырабаў.

Для навуковай супольнасці даследаванне ўяўляе сабой у пэўнай ступені заклік да перагляду і пераасэнсавання некаторых пастулатаў, якія страцілі сваю актуальнасць. У прыватнасці, аўтарам абгрунтавана мэтазгоднасць пераходу да тэрміналагічнага падмурку, які прапанаваны ў дысертацыі і які з большай

дакладнасцю дыферынцыруе мастацкія напрамкі ў галіне народнага мастацтва і дазваляе выпрацаваць найбольш эфектыўныя падыходы для вывучэння кожнага з іх. Такі падыход дыктуецца ўзрастаннем мастацкай граматнасці грамадства і патрэбай больш глыбокага разумення сучасных працэсаў у галіне традыцыйнага мастацтва. Вынікі дысертацыі могуць стаць комплексна абгрунтаваным навуковым падмуркам для далейшай распрацоўкі праблемы фалькларызацыі сучаснага народнага мастацтва.

Сацыяльная значнасць вынікаў дысертацыі праяўляецца ў магчымасці выкарыстання аналітычнага матэрыялу для вырашэння праблем, звязаных з разрывам пераемнасці традыцый паміж пакаленнямі і захаваннем этнічнай самабытнасці беларускай культуры ва ўмовах глабальнай уніфікацыі культур.

**Апублікаванасць вынікаў дысертацыі ў навуковым друку.**

Асноўныя палажэнні дысертацыі знайшлі адлюстраванне ў 10 публікацыях, у тым ліку 7 – у рэцэнзуемых навуковых часопісах і зборніках РБ (3, 33 аўтарскіх аркушаў), 3 – у зборніках канферэнцый (1,74 аўтарскіх аркушаў). Агульны абъём публікацый складае 5,1 аўтарскіх аркушаў. Усе публікацыі суіскальніка выкананы да пачатку папярэдняй экспертызы дысертацыі.

**Адпаведнасць афармлення дысертацыі патрабаванням ВАК.**

Агульны аб'ём дысертацыі складае 256 старонак, з якіх асноўны тэкст дысертацыі займае 115 старонак, бібліяграфічны спіс – 19 старонак, спіс публікацый суіскальніка – 2 старонкі, Дадатак А – 5 старонак, Дадатак Б – 4 старонкі, Дадаткі В – 16 старонак, Дадатак Г – 95 старонак. У Дадаку Г змешчаны ілюстратыўны матэрыял, які дапаўняе тэкст дысертацыі і ў візуальнай форме раскрывае пытанні, паднятыя ў дысертацыі аўтарам.

Дысертацыя і аўтарэферат Э. Г. Шындлер афармлены ў адпаведнасці з патрабаваннямі, якія прад'яўляюцца да падобных работ ВАК Рэспублікі Беларусь.

**Адпаведнасць навуковай кваліфікацыі суіскальніка вучонай ступені, на якую ён прэтэндуе.**

Дысертацыя Э. Г. Шындлер "Пластычны фальклор і фальктарызм у сучасным народным мастацтве Беларусі" з'яўляецца завершанай самастойнай кваліфікацыйнай работай, у якой распрацавана актуальная і важная ў навукова тэарэтычных, практычных і сацыяльных адносінах тэма, накіраваная на выяўленне адзнак пластычнага фальклору і праяў пластычнага фалькларызму ў

сучасным народным мастацтве Беларусі. Тэкст дысертацыі выкладзены ясна, лагічна, паслядоўна, прафесійнай навуковай мовай.

Адпаведнасць дысертацыі спецыяльнасці 17.00.04 – выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва і архітэктура, актуальнасць, навізна і важнасць навуковых задач, якія вырашаюцца ў дысертацыйным даследаванні, дакладнасць і абгрунтаванасць палажэнняў і высноў сведчаць пра асабісты ўклад аўтара ў навуку і дазваляюць лічыць навуковую кваліфікацыю Э. Г. Шындлер адпаведнай ступені кандыдата мастацтвазнаўства.

**Заўвагі і пытанні па дысертацыі і аўтарэфераце.**

1. Раздзел 3.1 «Рэдукаванасць фальклорнай традыцыі як асаблівасць сучаснага ткацтва» ўяўляецца некалькі перагружаным аналітычным матэрыялам па выяўленні адзнак пластычнага фальклору ў гістарычнай дынаміцы іх з'яўлення і развіцця. Мэтазгодна было б абмежавацца выяўленнем адзнак пластычнага фальклору і праяў пластычнага фальклярызму толькі на ўзроўні ткацкага рамяства як цэласнай з'явы і не закранаць выяўленне адзнак пластычнага фальклору на ўзроўні асобнай мастацкай формы – жаночага святочнага строя, паколькі некаторыя адзнакі на згаданых узроўнях паўтараюцца.
2. Матэрыялы даследавання па выяўленні адзнак пластычнага фальклору ў традыцыйным мастацтве за перыяд, які папярэднічаў канцу XIX ст., вынесены ў Дадатак В, што парушае цэласнасць успрымання выкладзенага аўтарам аналітычнага матэрыялу.
3. Нягледзячы на тое, што ўсе палажэнні дысертацыйнага даследавання ў поўнай меры раскрыты и абгрунтаваны аўтарам, у даследуемые віды сучаснага народнага мастацтва, побач з ручным ткацтвам, ганчарствам і саломапляценнем, мэтазгодна было б уключыць сучасную выцінанку, якая зазнала дастаткова высокую ступень трансфармацыі мастацкай формы.

Заўвагі не змяншаюць значнасці дысертацыйнага даследавання, абгрунтаванасці яго асноўных высноў і вынікаў.

**Заключэнне.**

Дысертацыя Э. Г. Шындлер "Пластычны фальклор і фальклярызм у сучасным народным мастацтве Беларусі" па ўзроўню навуковай і практычнай значнасці адпавядае патрабаванням Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі

Беларусь да кандыдацкіх дысертацый. Аўтар дысертацыі заслугоўвае прысуджэння вучонай ступені кандыдата мастацтвазнаўства па спецыяльнасці 17.00.04 – выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва і архітэктура

**за:**

- абгрунтаванне неабходнасці ўвядзення ў навуковы ўжытак тэрмінаў «пластычны фальклор», «пластычны фальклорызм» і мэтазгоднасць іх выкарыстання ў галіне народнага мастацтва;
- удакладненне значэнняў базавых тэрмінаў і катэгорый у галіне народнага мастацтва;
- выяўленне адзнак пластычнага фальклору ў гістарычнай дынаміцы іх узнікнення і развіцця ў наступных відах народнага мастацтва: ручным ткацтве, ганчарстве, саломапляценні;
- вызначэнне і сістэматызацыю найбольш характэрных для беларускага народнага мастацтва праяў пластычнага фальклорызму;
- за распрацоўку алгарытму выяўлення адзнак пластычнага фальклору і праяў пластычнага фальклорызму і вызначэнне ступені фальклорызаванасці сучаснай народнай творчасці.

Доктар мастацтвазнаўства, прафесар,
загадчык кафедры дэкаратыўна-прыкладнога
мастацтва ўстановы адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
культуры і мастацтваў» Р. Ф. Шаура

«20» апреля 2024 г.

Отдел
правовой
и кадровой
работы

Подлинность подписи удостоверяю
Юрисконсульт отдела правовой и кадровой
работы Ю.А.Рыбакова
22.04.2024